WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ЖНІЎНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 160 (27024)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ ДАМОВІЛІСЯ Ў БЛІЖЭЙШАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ ЗНЯЦЬ ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ІСНУЮЦЬ У БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІНАХ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў дамовіліся ў бліжэйшай перспектыве зняць праблемы, якія існуюць у беларуска-расійскіх адносінах. Такая дамоўленасць была дасягнута ў ходзе сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў 22 жніўня ў Сочы.**

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў размаўлялі каля дзвюх з паловай гадзін. Кіраўнікі дзяржаў за гэты час абмеркавалі шэраг сур'ёзных пытанняў.

Лідары дзвюх краін крытычна падышлі да ацэнкі стану беларуска-расійскіх адносін і канстатавалі, што яны не адпавядаюць статусу стратэгічнага партнёрства. Былі названы канкрэтныя праблемы, якія павінны быць зняты ў бліжэйшай перспектыве. Прэзідэнты дамовіліся, што, пачынаючы з гэтай сустрэчы, яны зробяць шэраг практычных захадаў па аднаўленні высокага ўзроўню партнёрства паміж дзвюма краінамі.

У сувязі з гэтым кіраўнік расійскай дзяржавы асабліва падкрэсліў, што беларусы і расіяне — брацкія народы, звязаныя цеснымі вузамі, і ведаюць, што трэба зрабіць, каб не дапусціць разрыву брацкіх адносін.

На сустрэчы абмяркоўваўся ўвесь комплекс двухбаковых адносін, у тым ліку і ў рамках інтэграцыйных аб'яднанняў. Прэзідэнт Беларусі асабліва адзначыў, што неабходна забяспечыць безумоўнае паўнацэннае функцыянаванне Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі з 1 студзеня 2012 года. Беларусь панесла сур'ёзныя выдаткі, уключыўшыся ў гэты праект, але ідэя АЭП была свядома падтрымана, паколькі важна стварыць роўныя ўмовы для прадпрыемстваў і грамадзян на гэтай прасторы. Расійскі Прэзідэнт выказаў прынцыповую згоду з пазіцыяй беларускага калегі.

У ходзе размовы была абмеркавана тэма саюзнага будаўніцтва. Кіраўнікі дзяржаў гаварылі аб неабходнасці актывізацыі адносін у рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Яны папярэдне дамовіліся правесці Вышэйшы Дзяржаўны Савет Саюзнай дзяржавы ў лістападзе гэтага года. Кіраўнікам прэзідэнцкіх адміністрацый даручана канкрэтная прапрацоўка гэтага пытання.

Абмяркоўвалася будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі. Па выніках размовы дадзены даручэнні кіраўніку расійскай дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» Сяргею Кірыенку забяспечыць падпісанне ўсіх адпаведных пагадненняў па будаўніцтве і выдзяленні крэдытных рэсурсаў у верасні гэтага года аналагічна схеме і ўмовам, прынятым расійскім бокам пры будаўніцтве АЭС у Калінінградскай вобласці.

Прэзідэнты прадметна абмеркавалі таксама шэраг іншых канкрэтных пытанняў беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

У развіццё размовы, якая адбылася на нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы ў Астане, Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў гаварылі аб эфектыўнасці функцыянавання АДКБ. У прыватнасці, дэталёва абмеркаваны меры па аснашчэнні Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання сучасным узбраеннем, умовы функцыянавання ваенных баз замежных дзяржаў на тэрыторыі краін — удзельніц арганізацыі, пытанні прымянення фарміраванняў КСАР у зоне адказнасці АДКБ, а таксама рэгламенту пры прыняцці рашэнняў у арганізацыі з улікам асаблівай пазіцыі Узбекістана.

Мяркуецца, што ў снежні гэтага года на чарговай сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ гэтыя прапановы будуць фармалізаваны ў выглядзе адпаведных рашэнняў.

Вялікую ўвагу прэзідэнты ўдзялілі пытанням міжнароднай абстаноўкі, у тым ліку сітуацыі на Блізкім і Сярэднім Усходзе, у Еўропе.

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў падрабязна абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва краін з Украінай.

Прэзідэнт Беларусі дэталёва расказаў расійскаму калегу аб выніках візіту беларускай дэлегацыі ў Катар і дасягнутых у ходзе перагавораў дамоўленасцях. Аляксандр Лукашэнка таксама праінфармаваў Дзмітрыя Мядзведзева аб перспектывах супрацоўніцтва з Венесуэлай.

Сустрэча прэзідэнтаў праходзіла ў адкрытай, дружалюбнай і канструктыўнай атмасферы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

## «Праблемы атрымання альтэрнатыўнай інфармацыі ў Беларусі не існуе»


Фота БЕЛТА.

**Аб гэтым заявіў учора ў ходзе online канферэнцыі на сайце БЕЛТА міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі.**

Ён адзначыў, што ў рэспубліцы праходзіць шэраг розных ток-шоу, круглых сталоў і іншых мерапрыемстваў, дзе можна абмяняцца меркаваннямі, але многія так званыя незалежныя эксперты іх проста ігнаруюць. Зарэгістравана амаль 2 тыс. друкаваных, 90 электронных выданняў — гэта вялікая колькасць для адносна невялікай краіны. Акрамя дзяржаўных, ёсць прыватныя, незалежныя газеты, сеткавыя СМІ.

«Таму эксперты, каментатары, тыя, хто хоча выказацца, выказвайцеся! Праблемы распаўсюджвання і атрымання альтэрнатыўнай інфармацыі ў Беларусі не існуе. Гэта вялікія казкі нашай апазіцыі, што яе ў чымсьці прыціскаюць, не пускаюць некуды (яна часта сама нікуды не ідзе). Іншая справа, што не варта злавацца, а прыслухацца да таго, што кажуць іншыя», — сказаў Алег Праляскоўскі.

Разам з тым, на думку міністра, некаторыя СМІ займаюць не заўсёды аб'ектыўную пазіцыю, поўнасцю ігнаруюць недахопы, і Мінінфарм крытыкуе іх за бяззубасць. Але большасць дзяржаўных выданняў, і ў першых радах «СБ», даюць дастаткова крытыкі, якая наводзіць шорах на месцах, у радах кіраўнікоў, чыноўнікаў. Ёсць і іншая крайнасць — выданні, дзе няма ніводнага добрага слова аб краіне, грамадстве, дзе радуюцца ўсім паражэнням. «А ісціна пасярэдзіне. Журналістыка — гэта люстэрка. Аб'ектыўнай крытыкі (не крытыканства), напэўна, у «Советской Белоруссии», напрыклад, больш, чым у апазіцыйных, дзе толькі ўсё дрэнна. Свята прайшло — дрэнна, прайшло спартыўнае мерапрыемства — дрэннае мерапрыемства. Штосьці чыноўнік сказаў — глупства гаворыць. А гэта проста іншая пазіцыя», — лічыць Алег Праляскоўскі.

СТАР. 2

## «ГАЙДА НА АПОШНІЯ ШКОЛЬНЫЯ ЗАКУПКІ!»


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**ДА ШКОЛЫ лічаныя дні? Самы час зрабіць апошнія закупкі. І калі ў мяне запытаюцца, ці варта ісці на 12-ю Міжнародную спецыялізаваную выставу-кірмаш «Прывітанне, школа», што зараз працуе ў НВЦ «Белэкспа», я адназначна скажу: «Варта!». Хоць кошты на школьную прадукцыю тут не меншыя, чым у крамах. І выбар па мадэлях школьнай вопраткі нават, я сказала б, меншы, чым у тых жа сталічных універмагах.**

Але калі вы яшчэ не закуплялі, напрыклад, канцтавары, то лепш гэта ўсё ж рабіць на выставе, асабліва калі вы з тых бацькоў, якія хочуць, каб у дзіцяці быў, напрыклад, пенал не такі, як у суседа па парце. Між іншым, пра пеналы. На працягу месяца блукаю па крамах у пошуку пенала для свайго сына і амаль усюды бачу аднолькавы асартымент, нават малюнкі на пеналах не адрозніваюцца. А на выставе было з чаго выбіраць. Прычым па меншых цэнах, чым за аналагічны тавар у цумах-гумах (пенал на два аддзяленні на выставе можна знайсці на дзесяць тысяч таннейшы).

На выставу варта падацца яшчэ і таму, што тут можна адразу закупіць усё тое, што вам патрэбна для школы, — тут прадстаўлены тавар ад канцтавараў і заплечнікаў да школьнай вопраткі.

Тут можна не толькі параўнаць кошты, падабраць яркія падарункі свайму дзіцяці да новага навучальнага года, але і атрымаць пэўныя парады. Вам могуць падказаць, якія ручкі (алоўкі, сшыткі і г.д.) лепшыя. А таксама на выставе можна параіцца з прадстаўнікамі пазашкольных устаноў, у які гурток лепш аддаваць дзіця. Тут жа я, як маці вучня, зрабіла для сябе некаторыя адкрыцці. Але пра ўсё па парадку.

Уразіла тое, што сёлета на выставе амаль не прысутнічалі фабрыкі, якія вырабляюць адзенне афіцыйна-дзелавога стылю для школьнікаў.

Можа, фабрыкі проста не маюць патрэбы ў рэкламе?

— Сёлета гандаль школьным адзеннем вырас у параўнанні з мінулым. Людзі пачалі закупляць школьную форму загадзя. Многія глядзяць на цэннікі, хочуць набыць форму па старых коштах, — заўважылі прадстаўнікі ААТ «Гандальадзення», работнікі крамы «Вопратка». — Сёння ў продажы сапраўды ёсць яшчэ тавар, які застаўся з мінулага года і прадаецца па леташнім кошце. Але добры попыт і на новыя мадэлі, вырабы з новых тканін, напрыклад, добра прадаюцца касцюмы з фактурай тканіны ў «палосачку», мадэлі з пракладкай, якая абараняе ад электрамагнітнага выпраменьвання.

Як заўважылі прадаўцы, на любыя рэчы ёсць попыт, нават на дарагія. Бацькі гатовыя пераплаціць, калі бачаць прыгожыя рэчы. Касцюм на хлопчыка пачатковай школы можа каштаваць ад 122—160 тысяч, а на старшакласніка ад 270. Адна з найбольш папулярных хлапчуковых мадэляў сёлета — касцюмчык з вельвету са скуранымі дэталямі на плячах і локцях (скураныя нашыўкі абараняюць ад прашароўвання). Асартымент школьнай вопраткі ў гандлі сёлета даволі багаты, часам бываюць праблемы, калі не хапае касцюмаў пэўных памераў і росту, але ўсё гэта вырашаецца. Акрамя таго сёння можна многія касцюмы, што ёсць у продажы, разукамплектаваць — напрыклад, купіць толькі пінжак ці толькі штаны. Менш праблем і ў бацькоў з тым, каб падабраць штаны, якія падыходзілі б менавіта іх дзецям — паўната рэгулюецца пры дапамозе румак, ці гузікаў.

Хлапечыя касцюмы малых памераў бацькі выбіраюць такія, каб было паболей кішэняў. Для дзяўчынак да 8 класа ў асноўным бяруць сарафаны, а ўжо старшакласніцы ўбіраюцца ў касцюмы. Сярод найбольш папулярных дзявочых «школьных убораў» — мадэлі, якія прапануе да гэтага школьнага сезона фабрыка «Калінка». Дарэчы, касцюм ад «Калінкі» (троечка) пацягне на 300 тысяч. Наогул, каб апрануць па-дзеламу сваю дачку-першакляшку трэба выкласці каля 400 тысяч. І гэта толькі пачатак.

Як заўважылі на стэндзе ААТ «Гандальадзення», на выставу варта прыйсці хаця б і таму, што некаторых мадэляў, што тут прадстаўлены, сёння ў краме ўжо і не купіш.

А яшчэ варта сюды прыходзіць з дзецьмі, таму што даволі часта патрабаванні ў малых і дарослых не супадаюць. Так, на выставе маці хацела набыць сыну бардовую кашулю, а ён катэгарычна настаяў на белай.

Загадчыца фірмовай крамы № 4 «Галантэя» Ірына Тухто распавяла, што сёлета, як і летась, большы попыт на заплечнікі, на якіх намаляваныя героі мультфільмаў. Хлопчыкі выбіраюць чалавекаў-павукоў і панду, дзяўчаты — барбі і братц. Прычым для дзяўчат бацькі традыцыйна закупляюць ружовыя ранцы, а для хлопчыкаў — цёмных колераў, але абавязкова яркія, з малюнкам, аднатонны тавар у малодшых школьнікаў не «ў павазе». Для пачатковай школы мадэлі робяцца з жорсткай спінкай, каб у дзіцяці не парушаўся стан, рэгулююцца шлейкі. Акрамя таго, і важаць айчынныя ранцы значна менш, чым замежныя. Прычым кошт на беларускую прадукцыю меншы, напрыклад, для самых юных вучняў беларускі заплечнік можна купіць за 80 тысяч, а замежны цягне на 200.

Ёсць у продажы і заплечнікі, якія дазволяць бацькам зэканоміць на пенале — ручкі і алоўкі можна класці ў асобныя аддзяленні.

СТАР. 2

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ВІКТАРА ЯНУКОВІЧА З ДНЁМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці.**

«Беларусь і Украіну аб'ядноўвае не толькі агульная шматвяковая гісторыя, але і сяброўскія адносіны, якія традыцыйна склаліся, заснаваныя на прынцыпах добрасуседства і павагі», — адзначаецца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што сумеснымі намаганнямі плённае двухбаковае партнёрства краін будзе і надалей эфектыўна развівацца ў імя дабрабыту беларускага і ўкраінскага народаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў ЛІПЕНІ СКЛАЛА BR1 МЛН 854 ТЫС. 517

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у ліпені гэтага года склала Br1 млн 854 тыс. 517, паведамілі **БЕЛТА** ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Для параўнання: у чэрвені гэты паказчык быў роўны Br1 млн. 782 тыс. 857. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у чэрвені гэтага года склала Br1 млн 869 тыс. 237 (у чэрвені яна была Br1 млн 799 тыс. 416).

### СВІНІНА ПАДАРАЖЭЛА НА 10%

**З сённяшняга дня цэны на свініну патушную павялічваюцца на 10%.**

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 135 ад 22 жніўня 2011 года «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 27 красавіка 2011 года № 65». Такім чынам гранічныя максімальныя адпускныя цэны на свініну ўстаноўлены наступныя: на свініну патушную (у тушах і паўтушах) першай і другой катэгорыі — 13 225 рублёў за кілаграм, на свініну патушную (у тушах і паўтушах) трэцяй катэгорыі — 12 348 рублёў за кілаграм. Да гэтага гранічныя максімальныя адпускныя цэны на гэтыя віды мяса былі 12 023 і 11 225 рублёў за кілаграм адпаведна. Як адзначаецца на сайце Мінэканомікі, павышэнне гранічных максімальных адпускных цэн на свініну зроблена па прапанове Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання «ў мэтах кампенсацыі падаражэння кошту сельскагаспадарчай сыравіны». Нагадаем, што апошняе павышэнне цэн на свініну было ў пачатку жніўня — тады яно склала 5%.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### НА МІНСКІХ РЫНКАХ ПЕНСІЯНЕРАМ ВЫДЗЕЛЕНЫ МЕСЦЫ ДЛЯ ПРОДАЖУ СВАЁЙ ПРАДУКЦЫІ

**У Мінску на 15 рынках выдзелены гандлёвыя месцы для пенсіянераў і інвалідаў 1-й і 2-й групы — бясплатна або за сімвалічную плату — да 1600 рублёў у суткі.**

Тут яны могуць рэалізоўваць пладова-агароднінную прадукцыю, вырашчаную на прысядзібных участках. Акрамя таго, гарадская ветэрынарная станцыя да канца гэтага года будзе бясплатна праводзіць для вышэйназваных катэгорый грамадзян неабходныя даследаванні пладова-агароднінай прадукцыі, вырашчанай на прысядзібных участках, агульнай вагой да 10 кг.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,** *«Мінск—Навіны».*

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ВЫТВОРЧАСЦЬ БУЛЬБЫ БУДУЦЬ ПАВЯЛІЧВАЦЬ

**Вытворчасць бульбы ў Беларусі неабходна павялічваць, заявіў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч у час выязнога пасяджэння Прэзідыума Саўміна ў Талачынскім раёне, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

Чакаецца, што пасяўныя плошчы будуць пашырацца як пад харчовую бульбу, так і пад бульбу для тэхнічных патрэб. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што як толькі з'яўляецца ранняя бульба, нават з высокай крухмалістасцю сорту, яна ідзе ў асноўным у розніцу для харчовых мэт. Разам з тым на крухмальныя заводы з-за незбалансаванай цэнавай палітыкі пастаўляецца дробная, рэзаная, бітая бульба. «У выніку рэнтабельнасці няма, ніякай эканомікі на крухмальных заводах няма, яны не развіваюцца», — канстатаваў прэм'ер. У гэтай сітуацыі даводзіцца імпартаваць крухмал з іншых краін, у тым ліку для харчовай прамысловасці. У сувязі з гэтым прэм'ер-міністр адзначыў неабходнасць перагляду цэнавай палітыкі на бульбу для тэхнічных мэт. Пры гэтым ён падкрэсліў, што крухмал, які выпускаецца, павінен быць мадыфікаваным і прыдатным для выкарыстання ў кандытарскай, хлебапякарнай прамысловасці і нават медыцыне.

Для выканання ўсіх гэтых задач галоўнае забяспечыць высокую захаванасць бульбы ў міжсезонны перыяд. Міхаіл Мясніковіч таксама звярнуў увагу на неабходнасць атрымання аграрыямі якаснага насення бульбы. Паводле слоў кіраўніка ўрада, вытворцы павінны добра разумець увесь ланцужок вытворчасці гэтай культуры — хто займаецца першасным насеннаводствам, хто размнажэннем і г.д. «Такая сістэма закладзена пастановай урада, і калі яна будзе выконвацца, усё будзе нармальна, тады гэта насенне могуць выкарыстаць не толькі гаспадаркі, але і насельніцтва», — сказаў прэм'ер-міністр. Ён таксама дадаў, што калі якаснае насенне бульбы будзе пастаўляцца ў асабістыя падсобныя гаспадаркі, аб'ёмы вытворчасці якаснай бульбы могуць павялічыцца.

СТАР. 2

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовском райисполкоме (продавец),**
проводит открытый аукцион по продаже одним лотом обращенного в доход государства имущества, расположенного по адресу: **Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Бытча**, в составе: клуб ЛТО (инв. № 610/С-37561), об. пл. 85 кв.м; сарай для топлива (610/С-37569), об. пл. 66 кв.м; спальный домик (610/С-50706), об. пл. 87 кв.м (д. 53 а); спальный домик (610/С-50708), об. пл. 200 кв.м (д.52); спальный домик (610/С-50712), об. пл. 89 кв.м (д.49г); спальный домик (610/С-50713), об. пл. 90 кв.м (д.47а); спальный домик (610/С-50714), об. пл. 87 кв.м (д.48а); столовая (610/С-50717), об. пл. 171 кв.м.

**Начальная цена – 388 058 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 1,7690 га (водоохранная зона р. Бытчанка).**

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов.**

*Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.*

Аукцион состоится **26.09.2011 в 15.00** по адресу: **Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.09.2011 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

## У ДТЗ у Крыме загінуў начальнік Лідскай ДАІ

**У МІНУЛУЮ НЯДЗЕЛЮ на адной з дарог Крыма адбылося жудаснае ДТЗ, у якім загінуў начальнік Лідскай ДАІ Вадзім Дуброўскі.**

— 21 жніўня каля 16 гадзін на трасе «Новы Свет» кіроўца аўтамабіля «БМВ-728», які рухаўся ў кірунку Судака, здзейсніў наезд на апорную сцяну, а затым вылецеў у абрыў. Пасажыр загінуў на месцы, кіроўца з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай, пераломам асновы чэрапа і пераломам перадплечча дастаўлены ў рэанімацыю Судака. Яшчэ адзін пасажыр моцна не пацярпеў. Прычыны здарэння высвятляюцца, не выключана, што кіроўца перавысіў хуткасць і не справіўся з кіраваннем, — паведамляе Упраўленне ДАІ аўтаномнай Рэспублікі Крым.

СТАР. 2

БЕЛАРУСБАНК

**Вниманию держателей пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»**

С 01.09.2011 вознаграждение за снятие наличных денежных средств с отрицательного остатка счета (в пределах разрешенного овердрафта) с использованием банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» со счетом в белорусских рублях устанавливается в размере 3% от суммы операции.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | Лот № 1, 1/2 доли капитального строения одноквартирного жилого дома с инвентарным номером 235/С-2021 |
| Собственник (владелец) имущества | ИП Кувшинов Ю.А. |
| Местонахождение (адрес) имущества | д. Абузерье, Лукомльский с/с, Чашникский район, Витебская область |
| Стоимость имущества | Лот № 1 2 800 000 белорусских рублей (без НДС) |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 316 06 сентября 2011 года в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Коржов Алексей Игоревич тел./факс. (80212) 49 13 47, (8 029) 366 40 10, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 14 ч. 30 м. 06.09.2011 г. Минимальная величина первого шага — 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Сітуацыя

## ТАТАВА ДАЧУШКА

Ларыса ЦІМОШЫК


Фота з асабістага архіва Інашвілі.

— Ой, які цуд! Якая дзяўчынка!.. І што гэта ў вас, татачка, сумненні нейкія ёсць у гэтым дзіцяці, што да нас прыйшлі? — з такімі словамі прынялі на генетычную экспертызу па ўстанаўленні бацькоўства пару — Ілью Інашвілі, 52-х гадоў, і чатырохгадовую дзяўчынку Марыну.

— Ды што Вы!.. Барані Божа, я, наадварот, імкнуся засведчыць, што яна — мая дачушка, — адказаў мужчына.

І праз нейкі час атрымаў вынікі экспертызы, у якіх сам ніколі не сумняваўся: Міхеенка Марына Уладзіміраўна, якую 22 кастрычніка 2005 года нарадзіла Міхеенка Людміла Мікалаеўна, — яго дачка. «Атрыманыя вынікі даследавання ДНК пацвярджаюць біялагічнае бацькоўства Інашвілі Ільі Абрамавіча... Верагоднасць бацькоўства складае 99,999999%».

Гэтую экспертызу ён вырашыў зрабіць сам, хоць юрысты казалі, што ў яго справе гэтае даследаванне ніякім чынам не дапаможа.

А справа ў тым, што бацькам дзіцяці па дакументах лічыцца зусім іншы чалавек, які не мае ніякага дачынення да дзяўчынкі і нават даведаўся пра яе існаванне зусім нядаўна — ад самога Ільі Інашвілі, які імкнецца выправіць памылку і замацаваць юрыдычна сваё фактычнае бацькоўства: усе гады жыцця дзіцяці ён быў побач, любіў, расціў і выхоўваў яго. Марына не ведае іншага бацькі. Але яна падрастае і калі-небудзь абавязкова задасць пытанне: «Тата Ілья, а чаму мяне ўсе называюць Уладзіміраўна?» А ён вельмі баіцца, што дзіцяці давядзецца адказваць і пакутаваць з-за памылак, якія раней дапусцілі дарослыя.

Памылкі, сапраўды, былі. Але хто ж думаў, што штосьці робіць не так: жыццё ідзе сваім цугам, жывецца як жывецца, атрымліваецца як атрымліваецца, а што трэба вырашаць — неяк вырашыцца часам. Аказалася, што час вельмі часта не вырашае, а толькі заблытвае. Як у гэтай жыццёвай сітуацыі, у якой Ілья Абрамавіч адчайна імкнецца расставіць усе кропкі над «І» праз чатыры гады пасля нараджэння дачкі.

Ён звярнуўся ў рэдакцыю ў роспачы, не ведаючы, што рабіць. Звяртаўся да юрыстаў, шмат з кім кансультаваўся, прайшоў праз розныя інстанцыі — яго сітуацыя здаецца безнадзейнай. Атрымліваецца, што па законе ён для свайго дзіцяці — чужы чалавек. Але ж як нават вымавіць такое можна яму, грузіну, для якога род і дзеці — святое...

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНА МАЕ НАМЕР УТРАЯ СКАРАЦІЦЬ ІМПАРТ РАСІЙСКАГА ГАЗУ

**Міністр энергетыкі і вугальнай прамысловасці Украіны Юры Бойка заявіў у інтэрв'ю тэлекампаніі «5 канал» пра жаданне скараціць імпарт расійскага газу праз 5 гадоў на 70%, ці на 28 млрд кубаметраў, — да 12 млрд кубаметраў газу ў год.**

«Мы плануем з 20 мільярдаў кубаметраў уласнай здабычы выйсці на 27 мільярдаў праз пяць гадоў», — цытуе міністра агенцтва Reuters. Бойка сказаў, што краіна мае намер пашырыць здабычу газу як на шэльфе Чорнага мора, так і развіваць пры дапамозе замежных партнёраў здабычу сланцавага газу. «Некалькі кампаній ужо прыйшлі — гэта ў першую чаргу амерыканскія кампаніі, еўрапейскія: галандская Shell, а таксама італьянская Eni...», — сказаў міністр.

Адначасова ўрад рэалізуе праграму скарачэння спажывання расійскага газу за кошт энергазахавання, развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі і замены газу на вугаль украінскай здабычы. «Мы спажывалі 64 мільярды кубаметраў газу за год, сёлета мы будзем спажываць 54 мільярды, а налета яшчэ менш — прыблізна на 8-10 мільярдаў... Мы плануем, што будзем закупляць расійскага газу праз пяць гадоў 12 мільярдаў кубаметраў. Усё астатняе будзе здабывацца намі самімі ці будзе заменена альтэрнатыўнымі відамі энергарэсурсаў», — запэўніў міністр.

### ПАЎСТАНЦЫ ПРАРВАЛІСЯ Ў РЭЗІДЭНЦЫЮ КАДАФІ



**Лівійскія паўстанцы прарваліся на тэрыторыю рэзідэнцыі Муамара Кадафі ў Трыпалі. Як паведаміў канал «Аль-Джазіра», паўстанцам удалося прарвацца праз вароты ў вонкавым перыметры комплексу.**

Паводле паведамленняў тэлеканала, над рэзідэнцыяй быў бачны дым, у раёне Баб аль-Азізія, дзе размешчаны комплекс, раздаваліся выбухі. Неба над Трыпалі патрулюе авіяцыя НАТА, аднак прадстаўнікі альянсу не пацвердзілі факт бамбардзіроўкі рэзідэнцыі.

Ці знаходзіцца сам лівійскі лідар на тэрыторыі рэзідэнцыі, невядома. Раніцай 23 жніўня да журналістаў выйшаў сын лівійскага лідара Сейф аль-Іслам Кадафі і заявіў, што яго бацька Трыпалі не пакідаў. Акрамя таго, ён запэўніў СМІ, што сталіца па-ранейшаму знаходзіцца пад кантролем улад і ў горадзе «ўсё ў парадку».

### ВАЛІЙЦА ПАСАДЗІЛІ НА 4 МЕСЯЦЫ ЗА ЗАКЛІК ДА ПАГРОМАЎ У FACEBOOK



У Вялікабрытаніі маладога чалавека асудзілі да 4 месяцаў турэмнага зняволення за запіс у Facebook. На сваёй старонцы юнак заклікаў жыхароў Уэльса далучыцца да пагромаў, якія пачаліся ў Лондане на пачатку жніўня.

### НА КАМЧАТКУ ПРЫВЯЗУЦЬ НАДЗІМАНЫ КАТАЛІЦКІ ХРАМ



**На Камчатку ў хуткім часе будзе дастаўленая надзіманая мадэль каталіцкага храма, паведамляе Руская служба «Бі-Бі-Сі». Аўтарам ініцыятывы выступіў настаяцель каталіцкага прыходу ў Петрапаўлаўску-Камчацкім, польскі святар Кшыштаф Каваль.**

Паводле слоў Каваля, на Камчатцы пакуль няма каталіцкага храма, і надзіманая царква стане своеасаблівай альтэрнатывай паўнавартаснаму рэлігійнаму будынку, дзе вернікі змогуць мець зносіны са святаром і маліцца. Надзіманая царква ўяўляе сабою копію каталіцкага храма. Усярэдзіне маецца даволі прасторнае памяшканне. Вага надзіманага храма складае каля ста кілаграмаў. Святар адзначыў, што пакуль расійскія ўлады не даюць яму дазволу на будаўніцтва будынка касцёла на паўвостраве.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2011 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 5 037,00 | 1 чэшская крона | 298,89 |
| ▲ 1 еўра | 7 268,39 | 1 польскі злоты | 1 757,16 |
| 1 латвійскі лат | 10 272,25 | ▲ 1 расійскі рубель | 173,96 |
| 1 літоўскі літ | 2 111,06 | 1 украінская грыўня | 629,74 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 28,9547 |
| 10 UAH | 36,1821 |
| 10000 BYR | 57,4954 |
| EUR | 41,6600 |

ISSN 1990 - 763X

# Краіна здароўя

Выпуск № 49 (285)

Май на ўвазе!

# ДРЭННАМУ ХАЛЕСТЭРЫНУ — ДОБРУЮ ДЫЕТУ

**АПОШНІМ часам слова «халестэрын» нярэдка сустракаецца ў нашых размовах. Гэта такое сучаснае пудзіла, якое заслужыла славу забойцы № 1.**

## Дрэнны і добры

Тое, што «вялікі» халестэрын шкодны для здароўя, ведае, бадай, кожны. У той жа час гэтае тлушчападобнае рэчыва жыццёва неабходнае чалавеку. Яно ўваходзіць у склад абалонак (мембран) усіх клетак арганізма, без яго не адбываецца сінтэзу некаторых гармонаў, патрэбна яно таксама для ўтварэння вітаміну D і многіх іншых важных працэсаў. Але незалежна ад усіх гэтых добрых спраў, калі канцэнтрацыя халестэрыну ў крыві павышана, гэта можа прывесці да розных наступстваў. Асабліва калі зашмат халестэрыну «дрэннага».

Медыкі адрозніваюць два віды халестэрыну, умоўна называючы іх «дрэнны» і «добры». Гэта значыць, як рэчыва халестэрын аднолькавы, але ў крыві ён знаходзіцца ў рознай «упакоўцы», якую называюць ліпапратэідамі. Гэта маленькія сферы, якія пераносяць па крыві халестэрын і іншыя ліпідныя малекулы. Адны з іх — ліпапратэіды нізкай шчыльнасці — нясуць халестэрын з печані, дзе ён сінтэзуецца. Калі іх утвараецца вельмі шмат або парушаны іх распад, у крыві назапашваецца шмат халестэрыну. І тады ліпапратэіды нізкай шчыльнасці можна назваць «дрэннымі». У разгорнутым лабараторным аналізе ліпідаў (тлушчаў і тлушчападобных рэчываў) крыві гэты паказчык абазначаецца скарочана — ХС ЛПНШ.

Лішак халестэрыну адкладваецца на ўнутраных сценках сасудаў у выглядзе тлушчавых утварэнняў, вакол іх разрастаецца злучальная (рубцовая) тканка. Так фарміруецца бляшка. Маленькія бляшкі застаюцца «мяккімі», але больш «сталыя», вялікія бляшкі маюць тэндэнцыю ўтвараць фіброзныя шапкі, у якіх адкладваецца кальцый, і тады адбываецца кальцыфікацыя артэрый. Гэта прыводзіць да атэрасклерозу: звужэння артэрый і іх зацвярдзення, парушэння кровазвароту. Але што больш небяспечна — бляшка можа разарвацца, і тады на яе паверхні ўтвараецца тромб — кангламерат клетак (у асноўным трамбацытаў) і бялкоў крыві. Ён можа вырасці да такой ступені, што, як корак, закрые прасвет сасуда. Цячэнне крыві спыняецца, тканка органа без кіслароду і пажыўных рэчываў адмірае. Калі гэта адбываецца ў сэрцы — развіваецца інфаркт міякарда, калі ў мозгу — інсульт.

Аднак не ўсё так дрэнна. У нас у крыві знаходзяцца і іншыя — «добрыя» — ліпапратэіды высокай шчыльнасці (ЛПВШ). Яны захопліваюць і пераносяць халестэрын з месцаў яго збірання ў сценках крывяносных сасудаў назад у печань, дзе з халестэрыну ўтвараецца жоўць. Тым самым яны не даюць утварацца бляшкам.

Атрымліваецца, страшны не столькі «павышаны халестэрын», колькі няправільныя суадносіны «добрых» і «дрэнных» ліпапратэідаў. Чым вышэйшая колькасць у крыві ХС ЛПНШ (халестэрыну ў «дрэнных» комплексах) і чым ніжэйшы ўзровень ХС ЛПВШ (халестэрыну ў «добрых» комплексах), тым хутчэй развіваецца атэрасклероз.

*Узровень халестэрыну вызначаецца біяхімічным аналізам крыві. Паказчык агульнага халестэрыну не павінен перавышаць 5,2 ммоль/л. Нормы колькасці халестэрыну ЛПНШ у крыві для мужчын — 2,25—4,82 ммоль/л, для жанчын — 1,92—4,51 ммоль/л. Нормы ўзроўню халестэрыну ЛПВШ для мужчын — 0,7—1,73 ммоль/л, для жанчын — 0,86—2,28 ммоль/л.*

Праверыць узровень халестэрыну можна ў паліклініцы, зрабіўшы аналіз крыві нашча. Для атрымання дакладнага выніку апошні прыём ежы павінен быць за 12—14 гадзін да даследавання, алкаголю — за 72 гадзіны.

## Спецыяльная дыета

Штодзённая норма спажывання халестэрыну з ежай не павінна перавышаць 300 мг. А ў 100 г жывёльных тлушчаў змяшчаецца 100—110 мг халестэрыну. Менавіта таму трэба істотна скараціць у рацыёне або наогул выключыць спажыванне прадуктаў, якія змяшчаюць халестэрын або спрыяюць яго перавытворчасці ў арганізме. Да такіх прадуктаў адносяцца бараніна, свініна, ялавічына, субпрадукты (печань, ныркі, мазгі), тушонка, паштэт, пельмені, скурка курэй, сыравэнджаная каўбаса (у 100 г — 112 мг). Абмяжуйце ўжыванне доктарскай каўбасы, сасісак і сардэлек (у 100 г — 60 мг). Прыгатаваўшы мясны булён, астудзіце яго і зніміце з паверхні зацвярдзелы тлушч, гатовы асесці ў выглядзе бляшак на сценках вашых сасудаў. Мясныя стравы лепш замяніць сояй, фасоляй, сачавіцай, гарохам, якія маюць высокую каларыйнасць і змяшчаюць шмат расліннага бялку. Вельмі карысная рыба (акрамя ікры), асабліва тлустых гатункаў — скумбрыя, сардзіны, ласось, селядзец. У ёй прысутнічаюць тлустыя кіслоты амега-3, здольныя знізіць рызыку інфаркту міякарда на трэць!

Вельмі шмат халестэрыну ў жаўтках, таму ешце іх не больш як 2 на тыдзень. Багатыя на халестэрын і сметанковае масла (у 100 г — 190 мг), вяршкі, смятана, тлусты тварог, незнятае малако. Лепш выкарыстоўваць не жывёльныя тлушчы, а раслінныя алеі (кукурузны, аліўкавы, соевы), якія спрыяюць паніжэнню ўзроўню халестэрыну.

Для запраўкі салаты падыходзіць лімонны сок, спецыі, травы. А калі ўжо браць маянэз, то на аснове расліннага алею. Ешце хлеб з мукі грубага памолу, кашы, макаронныя вырабы, а «тоўстай» выпечкі (піражныя, бісквіты) пазбягайце, лепш — аўсянае печыва, фруктовае жэле і крэкеры.

Ужывайце за дзень не менш як 30 г харчовых валокнаў — чысцільшчыкаў кішачнага тракту. Яны змяшчаюцца ў грушах, персіках,



яблыках, квяцістай і марской капусце, гароху. У моркве, бураках, чорных парэчках, слівах, абрыкосах таксама ёсць пекцінавыя рэчывы, якія звязваюць і выводзяць «дрэнны» халестэрын з арганізма.

## 100 грамаў — гэта многа ці мала?

Аматары спіртных напояў часта апраўдваюць сваю схільнасць тым, што, маўляў, яны займаюцца прафілактыкай атэрасклерозу. Але сасудам карысныя толькі малыя дозы алкаголю, прычым добрага. У пераразліку на чысты спірт сутачная доза алкаголю не павінна перавышаць 30 г для мужчын (гэта 60 мл гарэлкі або каньяку, 300 мл віна, 720 мл піва) і 15 г для жанчын. Займаючыся прафілактыкай атэрасклерозу, памятайце, галоўнае — своечасова спыніцца.

## Рух і нагрузкі

Самы натуральны спосаб падтрымліваць сасуды ў добрай форме — гэта рух: фізічная праца, гімнастыка, танцы, прагулкі, словам, усё, што прыносіць адчуванне мышачнай радасці. У фізічна актыўных людзей узровень агульнага халестэрыну звычайна бывае нізкім, а ўзровень «добрага» — высокім. Паўгадзінная хада ва ўмераным тэмпе 3—5 разоў на тыдзень, каб пульс пачашчаўся не больш чым на 10—15 удараў у хвіліну, — цудоўны цыкл тэрапіі.

Нават людзі, якія пакутуюць ад хвароб сэрца і сасудаў, павінны сістэматычна атрымліваць умераныя нагрузкі, адводзячы на трэніроўкі па 30—40 хвілін у дзень, але не менш як тры разы на тыдзень. Толькі тады вы здолееце падмануць лёс і зменшыце на 40—60% верагоднасць смерці ад інфаркту, інсульту і іншых сардэчна-сасудзістых хвароб.

Аднак не перашчыруйце, асабліва на агародным участку. Выконвайце працу не спяшаючыся, з перапынкамі кожныя паўгадзіны. І ўлічыце, што вашы жаданні заўсёды вышэйшыя за фізічныя магчымасці, пакіньце рэкорды іншым.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

### Дарэчы

Фітатэрапія з'яўляецца дапаможным сродкам пазбаўлення ад «дрэннага» халестэрыну. З гэтай мэтай часта прымяняюцца пупышкі бярозы, цыбуля, сланечнік, часнок, спарыш, фіялка палявая, шыпшына.

✓ На 300 мл крутога кіпеню вазьміце па сталовай лыжцы пупышак бярозы, фіялкі палявой, шыпшыны, спарышу і патрымайце сумесь на слабым агні 20 хвілін. Пасля ахаладжэння і фільтрацыі настой прымайце па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень да яды на працягу 2 месяцаў.

✓ Зрабіце настойку з часнаку. Раздушыце вялікую галоўку часнаку, дадайце па 15 г свежай мяты і цэдры лімона, заліце 200 г гарэлкі або 100 г медыцынскага спірту. Праз тыдзень настойка будзе гатова. Прымайце па 1 ч. лыжцы 3 разы на дзень да яды курсамі па два месяцы. Такім жа чынам можна прыгатаваць і настойку з цыбулі.

Спіртавыя настойкі перад ужываннем разводзьце вадой 1:1.

Салон прыгажосці

# КАСМЕТЫКА НАРОДНАЯ, САДОВА-АГАРОДНАЯ



**НАША любоў да касметыкі з градкі вечная, а давер — бязмежны. Касметычная індустрыя ўзяла гэта на ўзбраенне і актыўна зарабляе на гэтым. Аднак медыкі наконт раслінная касметыкі спрачаюцца...**

## Маска з абрэзкаў

Галоўны сакрэт папулярнасці садова-агароднай касметыкі няхітры: гэта танна. І проста: вырас агурок на градцы, яго сарвалі (або купілі на рынку), парэзалі ў салату, абрэзкамі працерлі твар — вось вам і тонік коштам нуль рублёў. Не трэба купляць, варажыць, падыходзіць або не, трывожна ўчытвацца ў спіс інгрэдыентаў, спрабуючы зразумець, ці ёсць сярод усіх тых гліцэрылаў і дыметыконаў нешта шкоднае для скуры. Агурок — ён і ёсць агурок: ужо дакладна не нашкодзіць (мы ж яго ядзім!), а не дапаможа — дык і бяда невялікая.

Упэўненасць у тым, што касметыка з градкі, асабліва са сваёй асабістай, цалкам бясшкодная, — яшчэ адна ўмова, якая забяспечвала ёй надзвычайную папулярнасць у народзе. Усё, што выкарыстоўваецца для твару — пятрушка, морква, клубніцы, парэчкі, бульбачка, — ужо было не раз з'едзена з задавальненнем і без усякіх негатыўных наступстваў, а значыць, разважае кожны з нас, маскі з клубніц, і для скуры ўсё гэта бясшкодна.

Сапраўды, калі няма алергіі на пэўны прадукт, агародная касметыка наўрад ці нанясе нейкую шкоду. Хоць бы таму, што дзейнічае яна павярхоўна: можа змякчыць скуру (напрыклад, як маска з персіка), можа злёгку адбяліць (як праціранні тонікам з пятрушкі), можа танізаваць (як агурочная або бульбяная маска), можа ачысціць (у залежнасці ад таго, што яшчэ будзе дабаўлена — напрыклад, вотруб'е). Але не зможа яна ні прыбраць ужо наяўныя маршчыны, ні падцягнуць правіслую скуру, ні ўстараніць сасудзістыя зорачкі, ні назаўсёды пазбавіць ад вугрыстага сыпу. Дзейнічаюць такія сродкі на верхні пласт скуры, пранікаць углыб «не ўмеюць», таму чакаць ад агурочных прымочак і агрэставых прыцірак цудаў не варта — ні пасля першага прымянення, ні пасля сто першага.

І ўсё ж галоўная праблема выкарыстання любой раслінная касметыкі, хай гэта хатняя маска або нятанны «натуральны» крэм — магчымасць развіцця алергічнай рэакцыі. Таму, калі ведаеце, што на нейкую садавіну або ягаду ў вас алергія, не эксперыментуйце з іх вонкавым прымяненнем — вялікая верагоднасць пакрыцца плямамі або сыпам, які свярбіць.

***Медыкі наогул рэкамендуюць перад тым, як нешта нанесці на твар, пратэсціраваць прадукт на невялікім участку скуры.***

Вазьміце ягаду, прызначаную для маскі, расцісніце і змажце невялікі ўчастак у вобласці локцевага згібу. Калі скура пачырванела, з гэтага прадукту маскі рабіць не рэкамендуецца. Яблыкі, агрус, агрэст і кабачкі правакуюць алергічныя рэакцыі параўнальна рэдка, іх можна выкарыстоўваць практычна без абмежаванняў. А вось клубніцы, таматы і парэчкі выклікаюць большасць выпадкаў алергіі. Пры тым чырвоныя парэчкі значна менш алергенныя, чым чорныя. Наогул, працэдуры з хатняй касметыкай рэкамендуецца праводзіць не часцей за 2 разы на тыдзень.

## Мінусы

❒ Рызыка алергічных рэакцый. Ці будзе алергія — не адгадаеш, пакуль не скарыстаешся.

❒ Немагчымасць доўгага захоўвання. Гэта датычыцца і прамысловай касметыкі — калі яна заяўлена як натуральная (гэта, дарэчы, не значыць, што сродак зусім не змяшчае сінтэтычных кампанентаў), стандартныя тэрміны захоўвання для яе не падыходзяць.

❒ Адмысловыя ўмовы захоўвання. Самаробныя сродкі па доглядзе лепш наогул не захоўваць; сродкам прамысловай вытворчасці патрэбен халадзільнік.

❒ Спецыфічны пах. Тлумачыцца адсутнасцю парфумерных дабавак. Не самая вялікая праблема, але многіх гэта прымушае адмовіцца ад выкарыстання крэму, які «пахне лекамі».

❒ Немагчымасць праверыць на экалагічнасць. Гэта датычыцца касметыкі з градкі. Што ўнутр, што звонку лепш выкарыстоўваць тое, што вырашчана без выкарыстання пестыцыдаў і іншай хіміі.

❒ Дарагоўля. Самаробная маска з бульбачкі практычна нічога не каштуе. А вось крэм на аснове раслінных кампанентаў (так званая біё-, эка-, фітакасметыка) танным быць не можа.

## Лікбез

Як правіла, у чыстым выглядзе садова-агародная прадукцыя для догляду скуры не выкарыстоўваецца. З якой асновай яе спалучаць, залежыць ад тыпу скуры: для тлустай традыцыйна бяруць яечны бялок або касметычную гліну; для сухой — вяршкі, смятану, раслінныя або базавыя касметычныя алеі (напрыклад, алей персікавых костачак). Для ачышчальных масак выкарыстоўваюцца аўсяныя шматкі, жытні хлеб, кававая гушча, цукар і соль (апошнія даволі грубыя «ачышчальнікі», для твару яны не падыходзяць).

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## Крыніца — чыстая вадзіца



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхаркі вёскі Рогава Мінскага раёна мыюць гародніну на вясковай крыніцы.

## НЯЎЖО ПАХАМ ЕЖЫ ДУШУ ПАДМАНЕШ?

**Французскія даследчыкі даказалі, што пэўныя водары могуць зрабіць ежу ва ўяўленні людзей больш салёнай.**

Навукоўцы правялі эксперымент, у ходзе якога высветлілася, што калі ў стравах павялічыць інтэнсіўнасць асобных пахаў, гэта дазваляе скараціць колькасць солі ў ежы больш чым на чвэрць. У спіс салёных трапілі 14 водараў. З самых распаўсюджаных — гэта пахі сыру, бекону ці кумпяка, сардзін, селядца,ількі і арахісу. Яны актывуюць у чалавека асацыятыўную памяць і наша ўнутранае адчуванне салёнага смаку.

На працягу многіх стагоддзяў медыцына змагалася са злоўжываннем соллю, паколькі гэтая шкодная залежнасць становіцца прычынай развіцця многіх вельмі цяжкіх захворванняў. Спецыялісты запэўніваюць, што стварыць вышэйпералічаныя пахі можна без прымянення штучных інгрэдыентаў, а гэта вельмі аблегчыць жыццё гіпертонікам і сардэчнікам.

## СА СМАРТФОНАМ... У ПРЫБІРАЛЬНЮ

Як сцвярджаюць аўтары даследавання, апублікаванага ў Брытаніі, залежнасць сучаснікаў ад смартфонаў можна параўнаць з залежнасцю ад цыгарэт. У даследаванні паведамляецца, што 37 працэнтаў дарослых і 60 працэнтаў тынэйджараў, якія карыстаюцца смартфонамі, самі прызнаюцца, што «адчуваюць моцную ступень залежнасці» ад апаратаў. 30 працэнтаў карыстальнікаў смартфонаў паведамляюць, што карыстаюцца імі для частых размоў і ў рабочы час. 22 працэнты дарослых і 47 працэнтаў падлеткаў карыстаюцца смартфонамі нават у прыбіральні. Абсалютная большасць карыстальнікаў трымаюць смартфоны ўключанымі на працягу сутак, і больш за палову адказваюць на званкі, нават калі яны паступаюць ноччу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

**Аукцион состоится 28 сентября 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **22.09.2011** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

**Победитель аукциона обязан:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 11 миллионов рублей. **Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

| № лота | Адрес земельного участка, по ПДП «Детальный план индивидуальной жилой застройки в районе деревни Городщина Могилевского района» | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № 26 | участок № 144 | 0,1046 | 740100000001005941 | 985 381 | 30 780 000 | 2 770 000 |
| № 27 | участок № 145 | 0,1050 | 740100000001005943 | 952 408 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 28 | участок № 146 | 0,1050 | 740100000001005944 | 952 408 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 29 | участок № 147 | 0,1050 | 740100000001005945 | 964 326 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 30 | участок № 148 | 0,1050 | 740100000001005946 | 964 326 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 31 | участок № 149 | 0,1038 | 740100000001005947 | 985 381 | 30 545 000 | 2 749 000 |
| № 32 | участок № 150 | 0,1038 | 740100000001005948 | 954 052 | 30 545 000 | 2 749 000 |
| № 33 | участок № 151 | 0,1050 | 740100000001005949 | 939 972 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 34 | участок № 152 | 0,1050 | 740100000001005950 | 938 508 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 35 | участок № 153 | 0,1050 | 740100000001005951 | 938 508 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 36 | участок № 154 | 0,1050 | 740100000001005952 | 938 508 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 37 | участок № 155 | 0,1045 | 740100000001005953 | 954 052 | 30 751 000 | 2 768 000 |

## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

**Аукцион состоится 30 сентября 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **26.09.2011** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

**Победитель аукциона обязан:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 11 миллионов рублей. **Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

| № лота | Адрес земельного участка, по ПДП «Детальный план индивидуальной жилой застройки в районе деревни Городщина Могилевского района» | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № 38 | участок № 169 | 0,1045 | 740100000001005954 | 985 381 | 30 751 000 | 2 768 000 |
| № 39 | участок № 170 | 0,1050 | 740100000001005955 | 939 972 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 40 | участок № 171 | 0,1050 | 740100000001005956 | 964 326 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 41 | участок № 172 | 0,1050 | 740100000001005957 | 977 856 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 42 | участок № 173 | 0,1050 | 740100000001005958 | 977 856 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 43 | участок № 174 | 0,1077 | 740100000001005959 | 1 022 409 | 31 693 000 | 2 852 000 |
| № 44 | участок № 175 | 0,1138 | 740100000001005960 | 983 974 | 33 488 000 | 3 014 000 |
| № 45 | участок № 176 | 0,1050 | 740100000001005961 | 939 972 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 46 | участок № 177 | 0,1050 | 740100000001005962 | 938 508 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 47 | участок № 178 | 0,1050 | 740100000001005963 | 938 508 | 30 898 000 | 2 781 000 |
| № 48 | участок № 179 | 0,1045 | 740100000001005964 | 954 052 | 30 751 000 | 2 768 000 |


Доктар адкажа

# «ПАДХАПІЦЬ» ПАРАЗІТАЎ МОЖА ЛЮБОЕ ДЗІЦЯ

**«5-гадовае дзіця заразілася глістамі... Падазраём, што віной усяму пясочніца. Паколькі педыятр на звычайным прыёме не распытаеш падрабязна пра гэтую непрыемнасць, хацелі б даведацца ад вас: як засцерагчы дзіця ад паўторнага заражэння і ці праўду кажуць, што амаль усе дзеці заражаюцца глістамі, але не ва ўсіх гэта праяўляецца?**

**Сям'я ЦЫБУНОВЫХ, *Гродзенская вобласць*».**

**Участковы ўрач-педыятр 23-й дзіцячай гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна ГРЫНЧУК:**

— Дзеці могуць заразіцца паразітамі праз брудныя рукі, пясок, глебу і ваду. Часам заражэнне дзіцяці можа адбыцца ўнутрывантробна, паколькі прасцейшыя, бактэрыі, вірусы, кандыды і лічынкі гельмінтаў могуць пранікаць у плод праз плацэнту з токам крыві, а таксама падчас родаў праз родавыя шляхі.

Верагоднасць заражэння дзяцей дашкольнага ўзросту глістамі роўная амаль 100 працэнтам. У дзяцей гэтага ўзросту яшчэ недастаткова развітыя гігіенічныя навыкі, а пазнанне навакольнага асяроддзя ідзе пераважна праз рот. Акрамя таго, у малых слаба развітыя абарончыя механізмы супраць інвазіі: недастаткова кіслае асяроддзе страўніка, слабы імунітэт. Высокая рухальная актыўнасць дзяцей ва ўзросце 1,5-3 гадоў спрыяе таму, што яны інфіцыруюцца дома, на прагулцы, у садку пры кантакце з забруджанымі прадметамі (вулічным абуткам, падлогай, цацкамі), у месцах агульнага карыстання, на вуліцы (гуляючы ў пясочніцы або на зямлі), а таксама падчас кантактаў з жывёламі (бадзяжнымі або хатнімі, калі тыя бываюць на вуліцы). Варта адзначыць, што ў дзяцей ва ўзросце пасля 7 гадоў верагоднасць заражэння гельмінтамі не намнога меншая, чым у дашкольнікаў.

У нашай краіне найбольшае распаўсюджванне маюць такія гельмінты, як аскарыды, астрыцы і ўласаглавы.

## ЯК ДЗІЦЯ МОЖА ЗАРАЗІЦЦА?

Заражэнне адбываецца пры трапленні ў арганізм яек або лічынак глістоў. Яйкі трапляюць у навакольнае асяроддзе з калам інфіцыраваных людзей і жывёл. Яны маюць мікраскапічныя памеры, вельмі ўстойлівыя да розных уздзеянняў і могуць працягла захоўваць жыццядзейнасць у глебе, на паверхні прадметаў або прадуктаў, у складках бялізны, на скуры. Трапляючы ў ротавую поласць дзіцяці, яйкі глістоў праходзяць у страўнік, дзе часткова разбураюцца ў яго агрэсіўным, кіслым асяродку і далей актывізуюцца ў кішэчніку, дзе ўмовы для развіцця дарослых асобін найбольш спрыяльныя.

## ПРЫКМЕТЫ ГЛІСНАЙ ІНВАЗІІ

8 з 10 дзяцей дашкольнага ўзросту заражаны глістамі. Прычым толькі ў кожнага трэцяга захварэлага ёсць відавочныя сімптомы. Астатнія перажываюць захворванне у скрытай форме і не праходзяць неабходную супрацьглісную тэрапію.

Клінічныя праявы гельмінтозаў больш выражаны ў дзяцей, чым у дарослых. Глісты атручваюць дзіцячы арганізм прадуктамі метабалізму і негатыўна ўплываюць на стан здароўя дзіцяці. Яно становіцца кволым, капрызным, няўважлівым. Хутка стамляецца, скардзіцца на галаўны боль. Скура становіцца бледнай, пагаршаецца апетыт, парушаецца страваванне, з'яўляюцца алергічныя рэакцыі. Верагоднасць гліснай інвазіі вельмі высокая, калі ў дзіцяці з'яўляюцца наступныя сімптомы:

**1.** Слінацячэнне, ванітаванне, зніжэнне апетыту або паталагічнае яго ўзмацненне, боль вакол пупка або без пэўнай лакалізацыі (боль з'яўляецца незалежна ад прыёму ежы), панос або запор, павышаная стамляльнасць, частыя галаўныя болі або галавакружэнні, бледнасць і сінява пад вачыма, павышаная ўзбуджальнасць вечарам, беспрычынныя капрызы, дрэннае засынанне і дрэнны начны сон, які суправаджаецца прачынаннем, ускрыкамі, скрыгатаннем зубоў, свербам у вобласці прамежнасці.

**2.** Часта паразіты прыводзяць да алергізацыі арганізма, з'яўляюцца скураныя рэакцыі ў выглядзе атапічнага дэрматыту, які з цяжкасцю паддаецца сімптаматычнай тэрапіі. Нярэдка ўзнікаюць ліхаманка, боль у мышцах і суставах, высыпкі па тыпе крапіўніцы. Пры міграцыі праз лёгкія назіраюцца кашаль, кроў у макроце, што выклікае падазрэнні на пнеўманію.

## ЯКУЮ ШКОДУ НАНОСЯЦЬ ПАРАЗІТЫ АРГАНІЗМУ?

❒ Паколькі глісты часцей за ўсё абжываюць кішэчнік, парушаецца яго работа, ён не спраўляецца з выпрацоўкай і ўсмоктваннем вітамінаў. З'яўляецца дысбактэрыёз, які праяўляецца болем у жываце, паносам, запорам, ванітаваннем, павышэннем адчувальнасці да алергенаў.

Урачы-алерголагі сцвярджаюць, што больш за палову ўсіх алергічных рэакцый — гэта вынік існуючага або перажытага гельмінтозу.

Паразіты адмоўна ўплываюць на абарончыя сілы арганізма, што зніжае імунітэт. Гэта прыводзіць да пачашчэння вострых рэспіраторных і інфекцыйных захворванняў, зніжэння выпрацоўкі абарончых антыцелаў пры вакцынацыі дыфтэрыі, пагаршаецца фарміраванне імунітэту пры рэвакцынацыі адру і слупняку. Таксама ў такіх дзяцей часцей адзначаюцца падманныя туберкулінавыя пробы (рэакцыя Манту).

Сусветная арганізацыя аховы здароўя адзначае, што сярод прычын, здольных выклікаць другасны імунадэфіцытны стан, на першым месцы — пратазойныя і глісныя інвазіі.

## МЕРЫ ПРАФІЛАКТЫКІ

❒ Усім членам сям'і вытрымліваць правілы гігіены, імкнуцца не дапускаць блізкага кантакту дзіцяці і яго асабістых рэчаў з хатнімі жывёламі.

❒ На вуліцы сачыць за тым, каб дзіця не падбірала розныя прадметы, не кантактавала з жывёламі.

❒ Прывучаць да асабістай гігіены (мыць рукі пасля наведвання вуліцы і прыбіральні).

❒ Перыядычна мыць з мылам цацкі, асабліва тыя, што прыносяцца з вуліцы. Пыласосіць не толькі дываны, але і мяккую мэблю, мяккія цацкі.

❒ Не даваць дзіцяці нямытую гародніну або фрукты, дрэнна тэрмічна апрацаваныя мяса і рыбу. Гародніну і фрукты лепш мыць з мылам, а ягады заліваць чыстай вадой, затым яе зліваць і прамываць плады праточнай вадой.

Выявіць глісныя інвазіі досыць складана, што тлумачыцца асаблівасцямі іх жыццёвага цыклу. Улічваючы высокую эпідэміялагічную верагоднасць глісных інвазій, іх здольнасць парушаць розныя функцыі арганізма, рэкамендуецца незалежна ад вынікаў аналізаў праводзіць прафілактычна-лячэбныя супрацьглісныя курсы з улікам ускосных прыкмет паталогіі. Дзецям дашкольнага ўзросту рэкамендуецца правядзенне прафілактычных антыгельмінтных курсаў двойчы ў год — вясной і восенню (лепш за ўсё ў красавіку-маі і кастрычніку-лістападзе).

Калі глісты выяўлены ў любога з членаў сям'і, у тым ліку ў дзіцяці, неабходна пралячыць усю сям'ю. У такой сітуацыі важна ўзмацніць і гігіенічныя мерапрыемствы, напрыклад, пракіпяціць і прапрасаваць з абодвух бакоў пасцельную і асабістую бялізну.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**




## ДЗВЕ ЎСМЕШКІ ФАРТУНЫ

...Як ні цяжка ў гэта паверыць, школу я закончыў 45 гадоў таму. Прыгожая дата! І мы, аднакласнікі, вырашылі яе адзначыць — сабрацца разам.

Сабраліся, як і трэба было чакаць, далёка не ўсе. Але ж сустрэча адбылася, мы ўбачыліся, пагаварылі, і я нават шмат што пачуў — у тым ліку для сваёй любімай звяздоўскай рубрыкі. Пакуль — толькі адна гісторыя.

...Мая аднакласніца Таццяна пасля заканчэння тэхнікума ўладкавалася на працу ў бібліятэку пры заводскім Палацы культуры. Працавала там і год, і два, але ж потым ёй далі зразумець, што на займаемай пасадзе павінен быць чалавек з вышэйшай адукацыяй, а не з сярэдняй спецыяльнай... Таму ёй трэба выбіраць: альбо паступаць на завочнае ў ВНУ, альбо...

Гэта, апошняе, у Таццяніны планы ну ніяк не ўваходзіла, і яна вырашыла, што лепш паступаць. Адзінае — клопатаў шмат было: сям'я ўжо, праца. А значыць, на сур'ёзную падрыхтоўку да экзаменаў часу вобмаль...

Як ні дзіўна, сачыненне, вусныя іспыты па мове і літаратуры яна здала досыць паспяхова — на чацвёркі. Заставаўся апошні экзамен — гісторыя. Ды з усімі яе датамі, з усімі партыйнымі з'ездамі... Іх дзяўчына не помніла, не ведала абсалютна! Таму двойка ўяўлялася проста непазбежнай!

Але ж на экзамен Таццяна пайшла. Выцягнула білет, убачыла два пытанні: першае — цараванне Івана Жахлівага, другое...

Вось яна — усмешка фартуны — калектывізацыя сельскай гаспадаркі! Пра яе дзяўчына пісала рэферат, калі вучылася ў тэхнікуме...

Адказы прымалі два выкладчыкі: жанчына і мужчына, якія досыць часта выходзіў з аўдыторыі — пакурыць... Выйшаў і ў той момант, калі Таня садзілася адказваць. Так што просьбы яе пачаць «з канца» — з другога пытання, пра калектывізацыю, ён не пачуў, а жанчына-экзаменатар ахвотна пайшла насустрач. Дзяўчына пачала адказ — ды бойка, дакладна...

Перапыніў яе той самы курэц: вярнуўся ў аўдыторыю, у каляжанкі спытаў:

— Ну, як веды?

— Ды на выдатна, — канстатавала жанчына і ціха дадала: — Зараз я выйду, а вы тут працягвайце.

— Што ж, ахвотна, — згадзіўся экзаменатар. — Пераходзім да другога пытання.

«Да... другога?!» — вушам не паверыла дзяўчына, але не разгубілася і яшчэ раз пачала свой узнёслы маналог пра калектывізацыю сельскай гаспадаркі.

— Дастаткова, малайчына, — пахваліў яе задаволены гісторык. — Яшчэ адно дадатковае пытанне — і я пастаўлю вам пяць.

— Не, не трэба... Не трэба дадатковага, — папрасілася Таццяна ды з такім гаротным выглядам, што выкладчыку нічога не заставалася, як паставіць ёй... чацвёрку і шчыра пажадаць поспехаў у вучобе, бо з такімі адзнакамі дзяўчына не магла не паступіць!

Яна паступіла. І адвучылася. А падчас сустрэчы мы разам падумалі, што, відаць, вось так чалавеку дапамагае Бог. Калі, безумоўна ж, хоча дапамагчы?

**Валерый ГАЎРЫШ,**
*г. Чавусы.*

## АЛЬБО ТЫ ІХ — АЛЬБО ЯНЫ...

У роднай вёсцы Жаркова, што на Пухавіччыне, мой добры знаёмец, супрацоўнік Фрунзенскага аддзела аховы Міхаіл, — госць чаканы. І чаканы заўсёды, але ж у той раз...

— Сынок, як жа добра, што ты прыехаў! — кінулася насустрач маці. — Мы гэтым вар'ятам рады не дамо!

— Якім вар'ятам? — не зразумеў сын.

— Ды шэршні... У сенцах пасяліліся.

Перш чым прыступіць да высялення, госць, як чалавек абачлівы, учыніў разведку. Гняздо вісела пад драбінай, па якой лазілі на гарышча. У дыяметры яно было сантыметраў з трыццаць і па форме нагадвала торт — кругленькае, роўненькае, у тры ярусы: больш, меншы і маленькі. Паміж імі — «калоны» з палец таўшчынёй і прастора... Карацей — найлепшы архітэктар пазайздросціў бы! Тым больш што будаваўся гэты палац не гадамі: у мінулы прыезд нават «падмурку» не было, а цяпер — цэлы рой жыльцоў. Ды каб людскіх, а то агрэсіўных, няпрошаных... Як жа іх вытурыць?

Для пачатку Міхаіл успомніў, што некалі пад ложак закінуў процівагаз. Цяпер дастаў, змахнуў павуціннe, агледзеў. Гума перасохла, там-сям патрэскалася, але ж ад шэршняў, вырашыў, абароніць. Адкруціў гафрыраваную трубку, каб не перашкаджала працаваць, нацягнуў на галаву. Наверх, на процівагаз, адзеў зімовую шапку (і вушы завязаў), следам — ватныя штаны, целагрэйку. Рукі схаваў у тоўстыя рукавіцы (бабуля калісь вязала. Добра, што не выкінулі)... У гэтай амуніцыі выпадкова зірнуў у люстэрка — ледзь не памёр ад жаху. Значыць, шэршні павінны таксама. Тым больш, што Міхаіл, падлезшы да гнязда, яшчэ і «газануў» на іх — перцам, з міліцэйскага балончыка.

Што тут пачалося!..

У паветра паднялася, напэўна, з тысяча раз'юшаных, крылатых тыграў, загула, накінулася на праціўніка і... Скінула з лесвіцы, выгнала ў двор! Першую атаку Міхаіл прайграў.

У другую — пайшоў у той жа вопратцы, але з поўным балончыкам дыхлафосу. Шэршні яшчэ раз ўзняліся, абляпілі яго адзенне — вось-вось, здавалася, разарвуць. Але ж дыхлафос сваю справу зрабіў: няпрошаныя госці, «абалдзеўшы» ад паху, пападалі долу. Мёртвыя? Жывыя? Хіба ў іх разбярэш? Таму Міхаіл на ўсялякі выпадак забраў бацькоў і з'ехаў з імі да сябе ў Мінск — спадзяваўся, што шэршні за дзень-другі альбо паздыхаюць, альбо ўцякуць...

Ды не тут тое было! Яны па-ранейшаму гаспадарылі ў сенцах, а дай ім волю — занялі б і хату.

Так што Міхаіл зноў нацягнуў процівагаз, тоўстыя штаны, ватоўку, зімовую шапку і бабуліны рукавіцы, узяў шост, па драбіне падняўся ўверх і (з надзеяй скінуць) тыцнуў у гняздо. Прамахнуўся! Раззлаваныя шэршні загулі, кінуліся на праціўніка. Той, аблеплены імі, выскачыў на вуліцу. Неяк абтросся, аддыхаўся, вярнуўся... Зноў тыцнуў, прамахнуўся, выскачыў...

Нарэшце гняздо ўпала! Міхаіл вынес яго ў двор. Убачыў соты, у якіх — у кожным ярусе, у кожнай ячэйцы — варушылася безліч лічынак і маленькіх (з пазногаць памерам) асобін. Дарослыя ж шэршні былі сантыметраў па пяць. І адзін такі прагрыз «скафандр» Міхаіла — на месцы ўкусу з'явілася вялікая чырвоная пляма.

Але ж вайна працягвалася. Міхаіл рашыў утапіць гняздо — занёс яго за вёску ў балотца. «Палац» не тануў. Хацеў спаліць — кінуў яго ў вогнішча. Ён не гарэў і не плавіўся! Прыйшлося ўзяць сякеру... Толькі цяпер праціўнік быў пераможаны і можна было заняцца сабой.

З укусам вяскоўцы раілі схадзіць да доктара. Але ж сусед — чалавек бывалы — сказаў, што лепшых лекаў, чым самагонка, тут быць не можа. Прынялі ўнутр, нейкай кропляй нацерлі звонку. Тыдні праз два месца ўкусу перастала свярбець, чырвоная пляма знікла.

...А я з усёй гэтай гісторыі зразумеў адно: з нахабнымі і агрэсіўнымі чужынцамі (у якія прыгожыя палацы яны б ні хаваліся) трэба змагацца, і змагацца да канца: газам, дыхлафосам, вадой, агнём, сякерай, сіламі «надзвычайшчыкаў» — пакуль не пераможаш, бо тут іншага не дадзена: альбо ты іх з дому выкурыш — альбо (дай слабіну!)... яны цябе.

**Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,**
*г. Мінск*

## «РОЗОВЫЙ ЦВЕТ, ДОВЕРЬСЯ ЕМУ...»

Гэты інцыдэнт (непрыемны выпадак, здарэнне) адбыўся ў хаце маёй сяброўкі, але ж мог — у чыёй заўгодна. Таму і варта расказаць: сцеражонага, як вядома, бог сцеражэ...

Пачну з агульнавядомага, з таго, што мы — жанчыны і мужчыны — вельмі не падобныя адно да аднаго. Па-рознаму чуем, бачым, думаем, адчуваем, перажываем, рознага трымаемся... Ды што там — да смешнага даходзіць: тая ж самая мая сяброўка, бываючы ў вельмі многіх установах (працуе рэвізорам), ніяк не магла зразумець, чаму (прабачце!) у казённых прыбіральнях яна са сваім сярэднестатыстычным ростам у метр шэсцьдзесят пяць дзверы зачыніць не можа альбо лбом у іх упіраецца. Лічыла спачатку, што гэта будаўнікі ва ўсім вінаваты — матэрыялы эканомілі. А потым датумкала, што ўсё куды прасцей. Аб'екты, як правіла, праектуюць мужчыны. Яны ж у тыя маленькія «дамкі» і заходзяць ненадоўга, і садзяцца рэдка. Прычым — як на крэсла: гэта значыць, роўненька, а жанчыны — не, ім прыгнуцца трэба...

Але гэта так, прыказка. Цяпер — казка.

Тая ж самая мая сяброўка вельмі любіць розныя слоічкі і бляшаначкі збіраць. І мае рацыю, бо ў тыя, дзе была смятана, можна вазончык які пасадзіць альбо ўвесну расаду; у тых, дзе былі селядцы ды салаты, зручна штосьці ў дарогу ўзяць. У посуд ад кавы і чаю добра прыправы нейкія ссыпаць, ад лекаў — аналізы ў паліклініку занесці... А ўжо рэшткі нейкіх страў злажыць і ў халадзільнік паставіць, — гэта ж як доктар прапісаў, бо і месца мала займаюць, калі не шкляныя — электрычнасці меней «ядуць».

Карацей, з майго пункту погляду (і любая жанчына пацвердзіць!) — гэтая гаспадыня ўсё рабіла правільна! А вось муж яе лічыў, што не: шмат што выкідваў, барахольшчыцай яе называў. А пад гарачую руку, здаралася, і наогул: адкрываў шафку, дзе жончыны слоічкі і бляшанкі стаяць, падстаўляў пакет для смецця — і потым усё на вуліцу, «оптам»...

Яна і тлумачыла яму, што для чаго, і прасіла... У апошні раз ён слова ёй даў! І яна...

У той дзень у яе вялікае мыццё было, апошні «Ваніш» у машыну высыпала, каб плямы вывеў.

Упакоўку ад яго хацела выкінуць. Але ж... Прыгожая (мае вытворца рацыю!) — ружовенькая, ладная, са шчыльнай накрыўкай. Можа, падумала, спатрэбіцца на што? Рэшткі парашку якога высыпаць ці мыла палажыць?

Спаласнула, абарвала лішнія паперкі, выцерла... А тут мужык якраз аванс дахаты прынёс, ёй у рукі аддаў. Хацела ў шафу занесці, на звычнае месца, — ды перадумала: адкрыла тую ўпакоўку, акуратна паклала грошы. Палюбавалася яшчэ: хораша ляглі... Падумала: ніводзін злодзей іх тут не знойдзе...

Пра тое, што далей было, здагадацца, мусіць, не цяжка: муж (не, ён чалавек неблагі — проста запальчывы, у гарачай вадзе пакупаны) «зачапіўся» за нейкую бляшаначку, раззлаваўся на ўсе астатнія, падставіў мяшок для смецця і...

Сяброўка, вядома ж, засмуцілася, бо грошай, ды па цяперашнім часе, было вельмі шкада! І нерваў сваіх шкада! І крыўдна...

Але ж на трэці дзень пасля прапажы яна ўжо казала, што ў гаспадарцы не без страт і нават цытавала рэкламу. Праўда, па-свойму, што гучала так: «Ваниш» — розовый цвет! Доверься ему — и денег нет!»

Мужу пра іх сяброўка не сказала. Але ўльтыматум паставіла: калі, маўляў, ён хоць адзін раз яшчэ навядзе «парадак» у яе «засеках», яна пасягне на яго... І выкіне ў смеццеправод усе яго цвічкі, шрубкі, свярдзёлкі, самарэзы і іншыя патрэбныя альбо проста мілыя сэрцу рэчы.

**А. РАДЗІНА,**
*г. Бабруйск*

## СУСАНІН АДПАЧЫВАЕ!

Адчуйце розніцу — калі мы, славяне, хочам некаму ліха, то так і кажам: «Каб табе скулу ў бок». А вось яўрэі жадаюць іншага: «Каб табе госць кожны дзень!».

Але ж я сваім была рада! Мяркуйце самі: прысмакаў панавозілі, стол накрываць дапамагалі, посуд мылі (ну, завядзёнка ў іх такая!), дровы seклі, у рады складалі (ды паленца ў паленца!), пустазелле касілі, ураджаі збіралі, нават пабудаваць нешта браліся, але гэта ўжо занадта было. Не для гэтага ж я іх чакала?!

Праўда, і сама да прыезду рыхтавалася. Жывучы на Дняпры, частавала рыбай: фаршыраваным шчупаком, катлеткамі з яго ж, сазанам...

На рэчку разам хадзілі, на ўлюбёнае месца ўсіх лучынцаў — Гарадок называецца. Там бераг вышынёй пад 20 метраў, рэшткі краснага вала, рака, лодкі, рыбакі... Краявіды — аж дух займае!

— Як па прамой, — кажу, — дык да возера Добрае тут рукою падаць.

Госці адразу: «А чаму яно Добрае? А як выглядае?..»

Карацей, назаўтра ж мы туды падаліся. Праўда, у аб'езд — праз Рагачоў, праз ходасаўскі лес, дзе любіў збіраць грыбы сам Караткевіч...

А дарогі, трэба сказаць, я там не вельмі помню, бо гэта ж за ракой, за вадой, як за бядой — далекавата. Ведаю толькі, што любая выводзіць на луг — да азёр... Я яшчэ, помню, бубніла, што спачатку будзе Падсёл.

І вось мы выехалі з лесу. І — убачылі возера! А паколькі ехалі на Добрае, значыць, гэта ж яно і ёсць?! Госці мае «абалдзелі» ад чысцюткай вады: і ў «закідкі» плавалі, і на спіне, і пырскі ўздымалі... Казалі: «Дзе ні стань, ключы б'юць...». А нам жа, лучынцам, гэта як бальзам на душу. «А то ж! — адказваю (пальцы веерам... Прычым не толькі на руках, але і на нагах, здаецца.) — Гэта ж Добрае!»

Каб іх канчаткова ўразіць, прапанавала схадзіць на Увічча — паглядзець, як у гэтым месцы Дняпро выгінаецца («вывіваецца»). Госці мае — ды з радасцю! Але ж... З паўкіламетра прайшлі, а ракі чамусьці... няма. Хоць быць павінна! Ёсць нейкі насып, бульдозерам зроблены... А была ж — «грыва», быў «Дзядкоў борак», дубкі раслі! Дык вот жа гады, кажу, зруйнавалі!

— Дубкі?! — жахнуліся госці. — Тады, і праўда, га́ды!

...Але ж час выйшаў: развіталіся мы з возерам, а потым і я — са сваімі гасцямі.

Назаўтра, яшчэ пад уражаннем, падалася да свайго сябрука, каб праз камп'ютар разгледзець здымкі, зробленыя на памяць, а заадно — распавесці, што каля Добрага зруйнаваны «Дзядкоў борак»...

Сябар слухае, глядзіць — то на мяне, то на экран камп'ютара — ды кажа (а ён за Днепр, за азёры, за ходасаўскі лес ведае ну ўсё чыста!):

— Дык гэта ж не Добрае... Гэта ж Падсёл.

...Тут, як кажуць, можна смяяцца! Справа ў тым, што азёры ідуць ланцугом пад лесам, па-іншаму выглядае толькі Каменнае, а Добрае і Падсёл знаходзяцца побач, і яны вельмі падобныя. Вось я і «лаханулася»...

Патэлефанавала потым гасцям, расказала, на якім жа возеры мы былі, разам пасмяяліся і вырашылі, што гэта прыгода ўпрыгожыла нашу сустрэчу нават больш, чым фаршыраваны шчупак!

...А на Добрае, дасць Бог, мы яшчэ з'ездзім!

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## АМАТАР КАТАЦЦА «ПАД МУХАЙ»

**Віцебскага кіроўцу, якога ў чарговы раз затрымалі за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане, арыштавалі на шэсць месяцаў і пазбавілі права кіраваць транспартным сродкам на пяць гадоў. Акрамя гэтага, вымусілі выплаціць частку і ранейшага штрафу — больш за 15 мільёнаў рублёў.**

Яшчэ да таго, як гэты грамадзянін быў спынены ДАІ нецвярозым за рулём, ён «не сябраваў» з законам. У 22 гады яго асудзілі да 2,6 года пазбаўлення волі за рабаўніцтва. У 2008-м наш «герой» быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне ў нецвярозым стане. У выніку яго аштрафавалі і пазбавілі права кіраваць транспартам. Але ж хутка мужчына зноў папаўся на тым, што катаўся «пад мухай». Яго пакаралі папраўчымі работамі тэрмінам на год з утрыманнем на карысць дзяржавы 15 працэнтаў заробку. У 2009-м, не маючы права кіравання, малады чалавек зноў сеў за руль — як заўсёды, па «звычцы» ў нецвярозым стане. За гэта зноў прыцягнулі да крымінальнай адказнасці — аштрафавалі аж на 21 мільён рублёў (*600 базавых велічынь* — **А.П.**).

Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік пракурора Першамайскага раёна Віцебска Васіль ЯКАЎЛЕЎ**, праз год, яшчэ не паспеўшы аплаціць названы вышэй штраф, мужчына зноў сеў за руль нецвярозым. І вось нядаўна яго арыштавалі на шэсць месяцаў з пазбаўленнем права кіравання транспартам на пяць гадоў і выплатай часткі ранейшага штрафу — 15 мільёнаў рублёў.

Цікава, што, як высветлілася, гора-кіроўца ехаў на аўтамабілі, які належыць яго маці.

Дарэчы, летась судамі Віцебскай вобласці былі асуджаны каля пяцісот грамадзян, якія ўчынілі аналагічнае правапарушэнне. У першым паўгоддзі гэтага года агульная колькасць крымінальных спраў па адпаведных артыкулах Крымінальнага кодэкса паменшылася на 12,5 працэнта ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НЕ ПАДЗЯЛІЛІ... НЯПОЎНАГАДОВУЮ

**У міліцыю патэлефанаваў 19-гадовы жыхар в. Навасёлкі (Ляхавіцкі раён) і паведаміў, што яго сябра нехта ўдарыў нажом.**

Калі аператыўная група прыбыла ў вёску пацярпелага, «хуткая дапамога» ўжо даставіла маладога чалавека ў бальніцу, дзе ён і памёр.

Падчас следства сябар загінулага, як і яго бацька з дзядзькам, імкнуліся заблытаць следчых, каб адвесці ад сябе падазрэнні, і давалі паказанні, якія не адпавядалі сапраўднасці.

Пры аглядзе хаты падазронага на адным з шасці нажоў была выяўлена невялікая плямка, якая аказалася крывёю. Следства сканцэнтравала ўвагу на бацьку і дзядзьку, і тыя ў рэшце рэшт сказалі праўду. Было ўстаноўлена, што сябры не падзялілі няпоўнагадовую. Калі адзін з іх сказаў, што тая цяжарная ад яго, другі ўдарыў сябра нажом. Дзяўчына ж заявіла, што з хлопцам не мела ніякіх адносін. Суд Ляхавіцкага раёна пазбавіў забойцу волі на 5 гадоў і 6 месяцаў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ПАДЧАС ПАЖАРУ МОЦНА ПАЦЯРПЕЎ КІРОЎЦА

**У 22.09 пажарным паведамілі, што на аўтамабільнай стаянцы за два кіламетры ад пагранічнага пераходу «Прывалкі» адбылося ўзгаранне двух аўтафургонаў. Падчас здарэння моцна пацярпеў чалавек, былі пашкоджаны два аўтамабілі.**

У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях мяркуюць, што падзеі развіваліся наступным чынам. Кіроўца фуры «DAF» з расійскімі нумарамі перакачваў дызельнае паліва з дапамогай электрапомпы. Адбылося кароткае замыканне. Мужчына зараз знаходзіцца ў рэанімацыі ў цяжкім стане: у яго апёкі 80 працэнтаў цела. У выніку пажару пашкоджана бакавая сценка аўтафургона «DAF», тэнт паўпрычэпа і часткова груз поліаміду суседняга аўтафургона «МАН» з беларускімі нумарамі. Загаранне было ліквідавана да прыбыцця падраздзяленняў МНС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




Амаль кожны раз яна прачыналася, калі горад яшчэ спаў. Ледзь-ледзь пачынала днець, людзей нідзе амаль не відаць і не чуваць, і жанчына, а жыве яна на другім паверсе, расчыняла на верандзе насцеж акно — і адразу ж адчувала, як свежае паветра абдавала твар шчымлівай і лагоднай прахалодай. Куст язміну ў апошні год падцягнуўся, і цяпер яго галлё нібыта просіцца да жанчыны ў госці: так-сяк абламала найбольш настырныя галіны; тыя, што можна было дастаць рукамі, адвяла ў бок. Вось, цяпер іншая справа: цяпер добра бачыць яна пад вокнамі сваіх кацянятак, яны задралі на добрую цётку свае кволенькія галоўкі, лыпаюць вочкамі, бывае, нядоўга могуць так трываць, тады яны проста куляюцца на бачок. Але — глядзяць, як толькі можна глядзяць на яе, на сваю кармiцельку, глядзяць мужна, з надзеяй.

— І вы ўжо прачнуліся, мае харошыя? Бягу, бягу!..

Наталля Цітаўна любіла раніцы. Хоць і выйшла год назад на пенсію, пазней прачынацца не стала. Гэта толькі марыла: вось стану пенсіянеркай, тады адасплюся. Дзе там! Ці тое прывычка, ці нешта іншае, але як толькі загаворыць на кухні радыё, яна ўжо на нагах. І сёння таксама, як і кожнага ранку, жанчына спярша паставіла на пліту чайнік, а пакуль вада будзе падаграваццa, заспяшалася на той жа балкон і пашукала вачыма сваіх гадаванцаў. А іх, прызнацца, і шукаць асабліва не трэба: кацяняткі тут як тут, а калі дзе і забавяцца, то адразу ж збягуцца пад яе балконам. Дакладней — спаўзуцца. Усе чацвёра. Яны зусім маленькія, кволенькія, і нават самая нізкая трава для іх пакуль вялікая перашкода, замінае. Наталля Цітаўна ж забылася пра чай, ён так і астыне ў кубку. Яна похапкам накрышыла хлеба ў неглыбокую місачку, наліла туды малака. Для іх хопіць ежы. Паўтарыла сваё «Бягу, бягу!», і асцярожна, каб не расплюхаць сняданак для кацянятак, на выцягнутай руцэ панесла місачку перад сабой. А калі тыя пачалі сілкавацца, кожнае кацяня пагладзіла, прымаўляючы:

— Сіроткі вы мае... Ешце, ешце, я вам яшчэ вынесу. Сама не вып'ю, а вам дам. Хто ж вінаваты, што ў вас мамкі няма. А дзе яна, вы, відаць, і самі не ведаеце. Толькі не паверу я, што кошка такіх маленькіх магла кінуць, адцурацца. Такіх харошанькіх. Чалавек, даруй Госпадзі, можа — вунь паказваюць па тэлевізары, а кошка не дазволіць сабе такога... Можа, забіў хто вашу матку, а? Піце, ешце... Вось і малайцы. Толькі не штурхайцеся, усім хопіць. Падрасцеце, тады вам гора менш будзе. Лаўчэйшымі і хітрэйшымі станеце.

На прыстрэшку ганка, Наталля Цітаўна толькі цяпер заўважыла, сядзела ўчарашняя вялікая чорная варона, не зводзіла вачэй з місы, у якой вабілі яе дробненькія кавалачкі хлеба, насычаныя малаком. Варона, відаць, аблізвалася...

— А, ты зноў тут? — з дакорам у голасе падняла на яе вочы жанчына.

Варона каркнула і, нібы засаромеўшыся яе, адвярнулася.

— Глядзі ў мяне: калі зноў у малых адбярэш ежу — лаяць цябе буду. Зразумела? Ты ж глянь якая здаровая, можаш знайсці сабе што падзяўбці, а дзе, скажы вось мне, яны, сіроты, возьмуць, хто паклапоціцца? Кыш!

Варона быццам зразумела жанчыну і паслухалася: узмахнула крыламі і пераляцела на суседняе дрэва, адкуль таксама не пераставала сачыць за кацянятамі і Наталляй Цітаўнай.

Тым часам на ганку паказалася з пузатай торбай новая суседка, жанчына сярэдняга веку. Як яе зваць-велічаць, Наталля Цітаўна не ведае, жыве яна высока — ажно на дзявятым, апошнім, паверсе, і з'явілася тут зусім нядаўна: памяняла, кажуць, двухпакаёвую кватэру на трох. Мае мужа і дачку-падлетка, гэта ўсе бачаць, ёсць у іх і даволі шыкоўная іншамарка. Дзе працуе гэтая жанчына, Наталля Цітаўна таксама не ведае, адно заўважыла, што кожнай раніцай яна спяшаецца некуды з туга набітай торбай. Як вось і цяпер. Новая суседка затрымалася каля Наталлі Цітаўны і кацянятак, моўчкі глядзела на іх, а тады напусціла на сябе строгасць і нечакана для яе прамовіла халодным, як лёд, голасам:

— Разводзіце тут антысанітарыю!

— Як гэта? — ад нечаканасці, пачуўшы такое, Наталля Цітаўна ажно хаўкнула ротам: яна ж спадзявалася, што новая суседка таксама паспачувае кацяняткам, якія рана засталіся без маці, а яна, бачце што!.. Цюкнула, бы маланкай.

— А начамі што яны выробляюць, каты гэтыя! — твар у новай суседкі ажно пачырванеў ад злосці, яна паставіла торбу перад сабой: відаць, цяжкая, а мо сабралася доўга перавыхоўваць Наталлю Цітаўну. — Спаць людзям не даюць. Вяселлі тут, бачце вы іх, ладзяць. Я на дзявятым паверсе жыву, і тое чую. Гэта непарадак.

— Пачакайце, пачакайце, не гарачыцеся, — пачала супакойваць суседку Наталля Цітаўна. — А я вось на другім паверсе, і мне каты не перашкаджаюць. Сплю. Не чую іх. Ага. Сплю і не чую.

— І спіце, а я не магу! Развялі тут звярынец. А сабак колькі! Божа, і што за людзі ў гэтым, цяпер ужо і маім, доме?! Вось там, на праспекце Касманаўтаў, дзе я жыла раней, такога няма. Але было. Я, я навяла парадак. Цяпер мяне там успамінаюць, упэўнена, усе добрым словам. А як жа інакш?!

Наталля Цітаўна ўздыхнула, раптам адчула, што перасыхае і храсне ў роце, а нейкая горыч захаланяла ёй у сярэдзіне грудзі. Усё ж яна знайшлася, каб сказаць:

— Не чакала я ад вас, жанчыны, такога зларадства. Вы ж сама маці. А кацяняткі сіроты... Няўжо вам не шкада іх?

— Калі шкадуеце, забярыце дамоў! — валёхаючыся з боку на бок, новая суседка пайшла па сваіх справах, і калі праходзіла пад клёнам, на якім сядзела варона, тая каркнула: «Кар-р!..», чым, падалося, нават спалохала яе, бо новая суседка ад каркання ажно здрыганулася, не адразу, а толькі ачомаўшыся, задрала галаву на дрэва, а тады зіркнула на Наталлю Цітаўну і папракнула: — Вось, атрымлівайце! Карміце, карміце і варон!.. Яны за вашымі кацянятамі даядуць. Не, я так не пакіну ўсё гэта!..

Настрой быў сапсаваны, але Наталля Цітаўна не асабліва зважала на ўсё гэта, а больш пачала супакойваць кацянятак, нібы і тыя чулі злую цётку і разумелі ўсё, што яна сказала.

— Не слухайце вы яе, ешце, ешце. Вазьмі, кажа, да сябе ў кватэру, калі так любіш... Гэта вас, мае харошыя, сказала, каб узяла. Я ўзяла б. Месца ёсць. А потым што буду рабіць, калі падрасцеце? Ці пракармлю я вас? Ды і прывыкну, а адрываць потым балюча. Ведаю. А так вы на свежым паветры куляецеся-забаўляецеся, траўку, якую трэба, знойдзеце, па дрэвах палазіце... А ў мяне што? Асабліва радасці мала... Жыллё як жыллё... Чатыры сцяны... Ложак, стол... Тэлевізар — уся радасць... А тут яшчэ такая аказія, мае харошыя: хварэю я часта, то бываю ў бальніцы... А каго папрашу, каб за вамі прыглядзіць і накарміць? Няма каго. Сын п'яніца, яму ключы не давяраю, а мужык, Сцёпка, памёр, ірад... А так, калі на вуліцы, з голаду не памрэце... Тут і сметніца побач... знайсці, кажуць, можна тое-сёе з ежы... Вам бы падрасці толькі хутчэй... на ногі стаць... А тая цётка, з дзявятага паверха, накінулася на вас, як учора варона... Вароне — даравальна: сама галодная... А ты ж, суседка, — чалавек, то не будзь варонай, не адымай у кацянятак ежу... Жывое ж... Няўжо не баліць? Хай варона не разумее... А чалавек павінен бы... павінен бы чалавек...

Варона, нібы таксама пачуўшы і зразумеўшы словы жанчыны, каркнула і паляцела прэч. Кацяняты, наеўшыся малачка, пачалі забаўляцца. «Што з іх возьмеш — дзеці ж», — шчасліва ўсміхнулася Наталля Цітаўна. Яна падняла парожнюю міску, паглядзела яшчэ раз на кацянятак, якія схаваліся ўжо ў кветніку — толькі па тым, што калыхаюцца лiліі, рамонкі і цынii, можна было зразумець, дзе яны, — і заспяшалася піць чай. За сталом зноў успомніла новую суседку: «Трэба ж быць такой!.. Ай-я-яй! «Не выпускаючы з рукі кубак, Наталля Цітаўна падалася на балкон. Сёрбаючы кароткімі глыткамі халодны чай, яна пашукала вачыма кацянятак. Кветкі стаялі нерухома. «Спяць», — падумала жанчына і тут убачыла, як на тое месца, дзе колькі часу назад стаяла міска з ежай для кацянятак, прыляцела варона з кавалкам нечага ў дзюбе, паглядзела па баках, а потым паклала прынесенае на дол і села на прыстрэшак ганка. Сядзела і не зводзіла вачэй з кавалка каўбасы, як паспела заўважыць Наталля Цітаўна: чакала, трэба думаць, кацянятак. Нібы і яна ведала, што тыя — сіроты, і іх трэба агарнуць цеплынёй і клопатам.

На вачах Наталлі Цітаўны выкругліліся слязінкі. Яна паглядзела на варону, іх позіркі сустрэліся.

— Прабач, — сказала жанчына птушцы. — Ты ведаеш, за што...

**ЛЕПЕЛЬСКОЕ РАЙОННОЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВО ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЗАКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

Административное здание площадью 83,2 кв. м, 1957 года постройки, расположенное по адресу: г. Лепель, пер. Озерный, 16, стоимостью 37 764 000 (Тридцать семь миллионов семьсот шестьдесят четыре тысячи) белорусских рублей. Стоимость имущества указана с НДС.

Аукцион состоится в г. Лепеле, пл. Свободы, 1, 26 сентября 2011 года.

УНП 300414037

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Сантехэлектромонтаж», в количестве до 4600 штук по цене 50000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвестору. Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 16.09.2011 г. по 30.09.2011 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Оплата приобретенных Обществом акций будет производиться не позднее 30 (Тридцати) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. Форма оплаты – путем безналичного расчета. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, — с 25.08.2011 г. по 15.09.2011 г. Срок, в течение которого осуществляется совершение сделок купли-продажи акций, — с 16.09.2011 г. по 30.09.2011 г. Сделки заключаются по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а. Конт. тел. 8 0232 57 41 91.

УНП 400052115

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА**

Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».

Зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.

Лицензия № 02250/0627487, выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.

Адрес: 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.

Режим работы: понедельник – четверг 9.00 – 17.45 (обед 13.00 – 14.00), пятница 9.00 – 16.45 (обед 13.00 – 14.00), выходной – суббота, воскресенье.

Выполняя функции Заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 16, 20 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89; 91; 73; 75 по ул. Притыцкого;
- жилой дом № 36 по ул. Чечота.

Цель проекта – Строительство объекта «Многоэтажный жилой дом № 35 (по генплану), в микрорайоне «Дружба-1» по пр. Дзержинского» общей площадью 46 046,88 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 39 238,74 кв.м.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – IV квартал 2009 года.

Окончание строительства: секции №№ 10-11 – декабрь 2011 г., секции №№ 12-13 – март 2012 г.

Месторасположение объекта – Московский район г. Минска микрорайон «Дружба-1», вблизи проектируемой станции метро, через пр. Дзержинского гипермаркет «Простор».

Жилой дом запроектирован: 6-7-8-9-14 этажей, 13 подъездов, 16 лифтов, всего квартир – 487, из них: 1-комнатных – 65 шт., 2-комнатных – 195 шт., трехкомнатных – 219 шт., четырехкомнатных – 8 шт. На первом этаже – служебное помещение Товарищества собственников.

Гостевые парковки предусматриваются вдоль проезда и на дворовой территории. Парковочные места автотранспорта планируются в коммунальной зоне микрорайона. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.

В состав общего имущества объекта входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механические, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с переменной сеткой колонн. Наружные стены – кирпич поризованный с утеплением. Окна (за исключением лоджий) – ПВХ профиль с двухкамерным стеклопакетом.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 11.02.2009 г. № 329-5/09. Получены положительные заключения КАиГ 08.10.2008 г. №10-08/146М, Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 21.10.2008 г. № 02-6/2184.

Получено разрешение Госстройнадзора № 2-203Ж-046/09 от 17.09.2009 г. на производство строительно-монтажных работ.

Участок площадью 4,1008 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 1107 (п. 10) от 21.05.2009 года для строительства объекта. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 02.07.2009 г. № 500/1054-856.

Заключение договоров создания Объекта долевого строительства проводится по неизменной на период действия договора цене. На дату опубликования декларации и по 16 сентября 2011 г., для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, к долевому строительству предлагаются 8 квартир общей площадью 529,14 м², расположенных с 3-го по 7 этаж, из них: двухкомнатные квартиры общей площадью 59,16 м² по цене 7,9 млн. руб. за 1 (один) кв.м общей площади; трехкомнатные квартиры общей площадью 87,08 м² по цене 7,4 млн.руб. за 1 (один) кв.м общей площади.

Заказчиком-Застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняют филиалы ОАО «Минскпромстрой», выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными сторонними организациями.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.

***Генеральный директор В.С. Нехай***

**АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ В г. КОБРИНЕ 29 СЕНТЯБРЯ 2011 ГОДА**
**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ**
**29 сентября 2011 года в 11.00**

| № лота | Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Расходы по подготовке документации, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская область, Кобринский район, дер. Полятичи, ул. Новая, 17 | 124380403601000104 | 0,1679 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 1 071 950 и расходов на публикацию данного извещения | 6 888 524 | 689 000 |
| 2 | Брестская область, Кобринский район, дер. Полятичи, ул. Новая, 19 | 124380403601000106 | 0,1560 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 791 060 и расходов на публикацию данного извещения | 6 400 286 | 640 000 |
| 3 | Брестская область, Кобринский район, дер. Полятичи, ул. Восточная, 29 | 124380403601000105 | 0,1762 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 1 102 850 и расходов на публикацию данного извещения | 5 044 103 | 505 000 |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**ОБ ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ**
**29 сентября 2011 года в 11.30**

| № лота | Адрес земельного участка/кадастровый номер/размер | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Расходы по подготовке документации, бел. руб. | Начальная цена земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Рокоссовского, 4 | 124350100001006430 | 0,1500 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 712 300 и расходов на публикацию данного извещения | 20 102 120 | 2 010 000 |
| 2 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 6 | 124350100001006427 | 0,1314 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 791 060 и расходов на публикацию данного извещения | 17 609 470 | 1 760 000 |
| 3 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 12 | 124350100001006426 | 0,1382 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | 1 102 850 и расходов на публикацию данного извещения | 18 520 760 | 1 850 000 |

**Аукционные торги состоятся 29 сентября 2011 года** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1 этаж.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

копию платежного поручения (с отметкой банка отправителя об исполнении) о внесении задатка на расчетный счет 3632002160014 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – **по 26 сентября 2011 г. включительно**;

копию документа, содержащего идентификационные сведения физического лица, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта), а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками на местности.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Аукционные торги признаются несостоявшимися в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае райисполком в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении земельного участка с увеличением его начальной цены на 5%).

**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 404 с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 26 сентября 2011 г. включительно. Тел. для справок 8(01642) 2 28 11, 2 33 68.**

**Полная информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by**

